галоўны прынцып, які вызначыў развіцце чалавецтва - творчасць, што пацвярджае аналіз даследаванняў развіцця крэатыўнасці асобы.

## МАГЧЫМАСЦІ БІБЛЕЙСКАЙ, АНТЫЧНАЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МІФАЛОГІІ Ў ФАРМІРАВАННІ У СТУДЭНТАЎ УЯЎЛЕННЯЎ АБ ФЕНОМЕНЕ ДЗЯЦІНСТВА

В.А.Грачова

Асаблівая роля дзяцінства у жыцці чалавека, яго працягласць, перыядызацыя і іншыя канстанты толькі параўнальна нядаўна (у гістарычных маштабах) сталі прадметам увагі вучоных, практыкаў, урэшце усяго грамадства. У станаўленні уяўленняў аб феномене дзяцінства у студэнтаў-культуролагаў важную ролю адыгрывае выкладанне гісторыі педагогікі, а у ім - у сваю чаргу - знаёмства са старажытнымі, міфалагічнымі вытокамі таго, што сёлета прынята называць агульначалавечымі каштоўнасцямі.

Спрадвечную мудрасць народаў міра, іх гістарычны вопыт (у тым ліку вопыт этычны і эстэтычны) змяшчаюць міфы. Сення гэта ісціна нарэшце не мае патрэбы у доказах. Да апублікавання дапушчаных разам з антычнай біблейская міфалогія, а таксама паганскія міфы розных народаў, у тым ліку славян. Міфы даюць нам уяўленне аб адыходзячых у таўшчыню стагоддзяў каранях менталітэту і нацыянальнага характару. Сюжэты і вобразы міфаў увайшлі у творы розных відаў і жанраў мастацтва, сталі свайго рода мастацкім "эсперанта". Аднак публікацыя яшчэ не азначае глыбокага асваення матэрыяла усімі тымі, каму ен накіраваны, асобна будучымі культуролагамі. Нашы апытанні паказалі, што веданне міфалагічных сюжэтаў і вобразаў яшчэ не стала часткай уяўленняў аб элементарнай гуманітарнай адукаванасці. Неясна пакуль, у якім узросце мэтазгодна знаёміць вучняў з міфалогіяй.

Трохгадовы вопыт выкладання у ВНУ гісторыі педагогікі у кантэксце гісторыі мастацтва, а таксама выкладання сусветнай мастацкай культуры у школе з тэатральным ухілам дае падставу зрабіць першапачатковыя вывады аб месцы міфалогіі у вучэбным працэсе, аб уплыве вывучэння гэтага курса на фарміраванне шэрагу ведаў і уяўленняў. Нашы вывады датычацца змесота заняткаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і методыкі іх правядзення.

У вобласці зместу заняткаў мы звярнулі ўвагу на наступныя факты:

1. Чым маладзей аудыторыя, тым вышэй яе інтарэс да сюжэту міфа (займальнасць, авантюрнасць). У юнацкім ўзросце (пасля 16 гадоў) інтарэс да маральных высноў і рэальных падстаў і вытокаў міфа павялічваецца.

2. З метадалагічнай кропкі погляду найбольш пераканаўчым уяўляецца падыход стваральнікаў двухтомніка "Мифы народов мира", якія разглядаюць любую міфалагічную сістэму як вобразна паэтычнае асэнсаванне нацыянальнай гісторыі, традыцый. Гэта дазваляе раўнаважна размясціць матэрыял і выкладаць яго нейтральна, па-за рэлігійнай альбо атэістычнай прапаганды.

3. Поўнае і сістэматычнае выкладанне міфаў ў суправаджэнні прыкладаў іх выкарыстоўвання ў міравым мастацтве дазваляе стварыць ў вучняў школы цэласнае уяўленне аб асаблівасцях міфалагічнага мыслення; у адрозненне ад фрагментарнага выкладання у курсе ВНУ. Гэта гаворыць аб карысці уключэння курса міфалогія у якасці факультатыўнага у старэйшых класах школы з мастацкім ухілам і на першых курсах ВНУ мастацтва.

4. Разам з агульначалавечымі каштоўнасцямі міфалогія дазваляе высвятліць псіхалагічную своеасаблівасць народаў, іх стварыўшых: адкрытую эмацыянальнасць, аптымізм, "авантюрнасць" грэкаў; схаваную палкасць, мудрасць, любоў да дзяцей (чадолюбие) яўрэяў; памяркоўнасць і дасціпнасць беларусаў, іх схільнасць да адухатварэння прыроды і сялянскай працы. Асаблівую ўвагу з пункту гледжання традыцый народнай педагогікі прыцягвае той факт, што беларускія багі гадавога калаўрота уяўляюць сабой складаную сям'ю. У гэтай сям'і мноства разнастайных родзічаў ўсіх пакаленняў: дзеці Лелі, маладуха Цаца, сталая красуня Цеця, стары Зюзя і гэтак далей.

У адносінах метадаў і прыёмаў выкладання нашы назіранні такія:

1. Мноства імен, тэм, сюжэтаў дазваляе праводзіць кантроль і замацаванне матэрыялу у форме віктарын, шарад, красвордаў, ігр тыпа папулярных тэлевізійных конкурсаў.

2. Маральныя высновы міфаў могуць стаць асновай дыспутаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыклад, "Бацькі і дзеці" - чым ідэалам аддадзім перавагу антычным альбо біблейскім.

3. Творчы характэр спецыялізацый дазваляе прапаноўваць і студэнтам і школьнікам заданні, якія патрабуюць вобразнай рэалізацыі: эцюды, розных жанраў (сцэнічныя, выяўленчыя, літаратурныя), стварэнне сцэнарыяў, шарад і г.д.

4. Параўнальны аналіз такіх вобразаў і сюжэтаў як "Іфігенія ў Аулідзе", "Нараджэнне Гефеста", "Крон і краніды" (антычныя міфы); "Ахвяраванне Аўраама", "Дачка Іефая", "Суд Саламона" (Ветхі Запавет) - дазваляе сфарміраваць у студэнтаў уяўленні аб феномене дзяцінства, яго успрыяцці рознымі народамі старажытнасці. Жывы інтарэс выклікае у студэнтаў праекцыя тагачасных уяўленняў дабрыні і зла на сучасныя этычныя нормы.

Больш жыва зацікаўлена успрымаюць гэты матэрыял студэнты спецыялізацый "выяўленчае мастацтва", "фальклор у тэатры". Гэта значыць тыя, у каго больш шырокі круг жывых асацыяцый з вывучаемых абласцей мастацтва.

Такім чынам, уключэнне міфалогіі у сістэму выкладання ВНУ культуры стварае больш спрыяльныя умовы не толькі для агульнай грамадскай адукаванасці, але і для асваення студэнтамі складаных паняццяў з вобласці тэорыі і гісторыі педагогікі.

## НАРОДНАЯ ПЕСНЯ ПАЎНОЧНАЙ І ПАЎДНЕВАЙ БЕЛАРУСІ (ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ)

А.В.Клеванец

Кафедра народных спеваў праводзіць штогод фальклорныя экспедыцыі па вёсках і мястэчках рэспублікі. Шукаем і запісваем на магнітафонную стужку народныя песні. Узімку студэнты робяць расшыфроўкі гэтых песень, і далей яны выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе і канцэртнай дзейнасці кафедры.

Фальклорныя матэрыялы кафедры папаўняюцца таксама і з іншых крыніц. Многія студэнты дзеннага і завочнага навучання запісваюць на магнітныя стужкі народныя песні па месцу жыхарства і прывозяць іх на кафедру. Адзін студэнт запісаў народныя песні на Беласточчыне, і яны існуюць у нас у якасці прыклада самых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ